# ЗВОН

Беларуская штодзенная палітычна-літэратурная часопісь.
Рукапісы павінны быць напісаны чытэльна. Аплата прынятых рукапісау залежыць ад рэдакцыі. Рукапісы назад не выдаюцца.
Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: м. Менск, Юбілейны дом.
Цана нумару 1 марка.

ГОД ВЫДАНЬНЯ I.

РЭДАКЦЫЯ адчынена штодня ад 9—12 гадз. і ад 5—7 гадз.

Цана абвестак:
за 1 радок за тэкстам . 2 м.
шукаючым працы, за абвестку . . . . 2 м.

№ 18. Менск, Пятніца 3 кастрычніка 1919 г. № 18

## Мая навука.

*Мне мудрасьці кніжнай не дау Бог пазнаці,*
*Мой бацька ня мог даць раскошау такіх:*
*Научыуся я слоу беларускіх ад маці*
*І дум беларускіх бяз школы і кніг.*
*Ад самай красы маіх дзен невяселых*
*Настаунікам быу беларускі абшар;*
*Усходы палеткау і гоманы у селах*
*Навуку сваю мне прыносілі у дар.*
*Душу акрылялі прыгожасьці сьвету,*
*Па гонях пад небам лунала яна,*
*Купалася у сонцы вяселкай расьпетай,*
*Сама, як вяселка, як казка-вясна.*
*І пьяная чарамі, пьяная песьняй,*
*Як сон заварожаны райскіх мясьцін,*
*Шаптала мне дзівы цьвітучых прадвесьняу*
*І песьняй лілася з паходам часін.*
*Бурлівая рэчка і млын гутарлівы*
*Адмерным разгоністым плюскатам вод*
*Складалі мне рытму мастацкіе зьвівы,*
*Парадкавалі складау раскоцісты ход.*
*Цяністые бітага шляху прысады*
*І, у вырай лятучые, гусяу шнуры*
*Гармонію уводзілі у песельным складу,*
*Сачылі нязгоднай зваротак ігры.*
*Зяленае поле рунеючым збожам,*
*Цьвітучая у сонечны цьвет сенажаць*
*Мне песьню квяцілі узорам прыгожым,*
*Вучылі, як словы у вянок завіваць.*
*Ад шопату сьпелых пшанічных калосьсяу,*
*Ад тэлесту лісьцяу узьмежных ігруш*
*Музычнае водгульле у песьню лілося,*
*Зьлівалося з жальбамі скрыўджаных душ.*
*Шум бору адвечнага казкавым сказам*
*Нашэптывау сумную повесьць жыцьця*
*І песьню у шум-гоман захоплівау разам,*
*Заснуушые думы будзіу з небыцьця.*
*А сонцо, скрозь сеючы іскры па сьвеце,*
*Мне песьню іскрыло нябесным сьвятлом,*
*А вецер, што у полі рве дзерны і сеці,*
*Дау волю і крыльля лунаці арлом.*
*Каса і сякера і цэп малацьбітны*
*Магутную волатау сілу далі;*
*Марозы і сьпекі далі гарт нязбытны*
*Мне песьню як звон, як пярун адлілі.*
*Так іншай ня знаушы навукі і школы,*
*У пацемках шукау і знайшоу божы дар:*
*Цяпер маімі скарбамі думы-саколы,*
*Цяпер беларускай я песьні уладар!*

**Янка Купала.**